# ІСКРЫНКА ТВОРЧАСЦІ



**Астапенка Ванда Васільеўна,**
*музычны кіраўнік*
*ДУА «Яслі-сад № 3 г. Дуброўна»*

## ФАРМІРАВАННЕ МУЗЫЧНА-ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ ВЫХАВАНЦАЎ ДЗІЦЯЧАГА САДА

*Артыкул прысвечаны вопыту работы музычнага кіраўніка па праблеме фарміравання музычна-творчых здольнасцей выхаванцаў дзіцячага сада праз тэатральна-гульнёвую дзейнасць.*

Як назваць чалавека, які аддаў амаль 40 гадоў выхаванню дзяцей дашкольнага ўзросту? Канешне, асоба. Вельмі дакладна сказана – адукацыя ў асобах. І мне таксама захацелася расказаць пра такога чалавека, адданага сэрцам сваёй справе.

У далёкім цяпер 1978 годзе прыйшла працаваць музычным кіраўніком у наш толькі пабудаваны дзіцячы садок «Сонейка» (цяпер дзяржаўная ўстанова адукацыі «Яслі-сад № 3 г. Дуброўна») маладзенькая дзяўчына з незвычайным іменем Ванда. Лёс закінуў Ванду Васільеўну Астапенка на Дубровеншчыну з Брэстчыны. Так і прыжылася яна тут і ніколі не шкадавала пра свае праведзеныя тут гады. Вялікі вопыт работы з маленькімі дзецьмі дапамагаў ёй заставацца аптымістам, нягледзячы на цяжкасці ў жыцці. Так як і наш педагагічны калектыў не ўяўляе сябе без Ванды Васільеўны, так і яна не ўяўляе свайго жыцця без нас, без маленькіх гарэзнікаў, без музыкі, без дзіцячых забаў. Заканчваецца навучальны год, і Ванда Васільеўна кажа: “Усё, болей не магу, няма сіл, трэба ўступаць дарогу маладым”. Але ж не так лёгка знайсці замену такому вопытнаму педагогу ў нашым невялічкім гарадку. Таму на пачатку новага навучальнага года зноў просім дапамогі ў нашай Ванды Васільеўны.

Вопыт работы з дзецьмі дашкольнага ўзросту па музычнай дзейнасці Ванды Васільеўны вялікі, і яна ім з радасцю дзеліцца са сваімі маладзейшымі калегамі на метадычных аб’яднаннях, семінарах. Асноўнай ідэяй яе вопыту з’яўляецца далучэнне дзяцей да мастацтва праз тэатральна-гульнёвую дзейнасць. На яе погляд, тэатральна-гульнёвая дзейнасць з’яўляецца яркім эмацыянальным сродкам, які фарміруе эстэтычны густ дзяцей. Тэатр уздзейнічае на ўяўленне дзіцяці рознымі сродкамі: словам, дзеяннем, выяўленчым мастацтвам, музыкай.

Чаму выбрана такая тэма? Як яна дапамагае развіццю дзіцяці дашкольнага ўзросту?

Актуальнасць выбранай тэмы відавочная: педагогіка з “дыдактычнай становіцца развіццёвай”, а значыць, выкарыстанне элементаў театралізацыі, імправізацыі ў працэссе навучання і выхавання дзяцей становіцца ўсё больш прыкметным, – кажа Ванда Васільеўна. Падчас знаёмства з сучаснымі ідэямі развіццёвай адукацыі, я ўясніла для сябе іх сутнасць, стараючыся прытрымлівацца галоўных прынцыпаў: развіццё, творчасць, гульня. Я падтрымліваю тыя педагагічныя ідэі, якія бачаць развіццё дзіцяці як актыўны працэс самасвядомасці, дзейнаснае стварэнне ўласнай асабістай біяграфіі. А дапамагчы яму ў гэтым павінен дарослы, звязаны з ім праз садзейнічанне і супрацоўніцтва. Вопыт маёй работы пацвярджае, што самым эфектыўным метадам навучання і развіцця музычна-творчых здольнасцяў у дзяцей з’яўляецца мастацка-гульнёвы вобраз (гульня, рух). Мастацка-гульнёвы вобраз стварае

Репозиторий ВГУ

аптымальныя ўмовы для развіцця творчых здольнасцей дзяцей дошкольнага ўзросту: актывізуе ўвагу, садзейнічае больш глыбокаму ўспрыманню і асмысленню музыкі, дапамагае дзейнічаць самастойна, упэўнена, развівае фантазію. У маўленчай, песеннай інтанацыі дзеці выразна перадаюць асаблівасці вобраза. На занятках дзеці спяваюць, танцуюць, слухаюць музыку, іграюць на дзіцячых музычных інструментах, чытаюць вершы, інсцэніруюць казкі. Спалучэнне некалькіх відаў дзейнасці дае дзіцяці магчымасць ажыццявіць свой творчы замысел найбольш ярка і маляўніча. Тэатралізаваныя гульні даюць вялікі прастор для творчых праяўленняў дзіцяці. Яны развіваюць творчую самастойнасць дзяцей, падтрымліваюць імкненне дзяцей самастойна шукаць выразныя сродкі для стварэння вобраза, выкарыстоўваючы рух, позу, міміку, розную інтанацыю, жэст. Для таго каб дзіця стала крэатыўным, неабходна абагаціць яго жыццёвы вопыт яркімі мастацкімі ўражаннямі, даць неабходныя веды і ўменні. Чым багацейшы вопыт дзіцяці, тым ярчэйшыя творчыя праяўленні ў розных відах дзейнасці. Таму вельмі важна з самага ранняга ўзросту далучаць дзіця да музыкі, тэатра. Захапіць дзяцей мастацтвам, навучыць іх разумець цудоўнае – галоўная місія музычнага кіраўніка. Менавіта мастацтва (тэатр) абуджае магчымасць разважаць аб навакольным, пра сябе, пра адказнасць за свае ўчынкі. Займаючыся з дзецьмі тэатралізаванай дзейнасцю, я звярнула ўвагу на наступнае: дзеці становяцца больш актыўнымі, пазітыўнымі, эмацыянальнымі.

У дзяцей развіваюцца камунікатыўныя і валявыя якасці асобы (ветлівасць, чуласць, дабрыня, таварыскасць, уменне давесці справу альбо ролю да канца). І я як педагог атрымліваю радасць, задавальненне ад самога працэсу сумеснай творчай дзейнасці са сваімі выхаванцамі.

Шлях станаўлення творчай асобы вельмі складаны. Ад першай іскрынкі самастойнай думкі да патрэбнасці думаць, мысліць, разважаць – немалы шлях. Тэмп праходжання гэтага шляху ў кожнага дзіцяці розны. Ванда Васільеўна лічыць: “Важна набрацца цярпення, не паскараць, не падганяць, не спяшыць даваць гатовыя рашэнні, не «карміць» дзіця перажаванай «духоўнай ежай». Творчае развіццё магчыма толькі пры наяўнасці станоўчых матывацый”.

Ванда Васільеўна – творчы чалавек. Кожны ранішнік праходзіць як тэатралізаванае шоу. Бацькі вельмі задаволены такім педагогам.

“Вельмі прыемна бачыць сваіх выхаванцаў, – кажа Ванда Васільеўна, – на сцэне раённага дома культуры са спевамі, танцамі, ігрой на музычных інструментах і думаць – жыццё прайшло недарма”. Магчыма, тая іскрынка, якую заклалі ў дзіцячым садзе, перарасце ў вялікае добрае полымя.

Репозиторий ВГУ